# Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Шаноўныя адзінаццацікласнікі! У гэтым годзе вы працягваеце вывучэнне вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». У 11-м класе аб’ектам вывучэння будзе перыяд гісторыі XIX — першай чвэрці XXI ст. Вам трэба будзе, абапіраючыся на веды, атрыманыя на ўроках гісторыі ў 8–9 класах, абагульніць і сістэматызаваць асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускага народа, выявіць асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі ў рамках сусветнага гістарычнага працэсу.

Дадзены вучэбны дапаможнік складаецца з дзвюх частак, якія аб’ядноўваюць чатыры раздзелы, і прызначаны для вывучэння вучэбнага прадмета на базавым узроўні. Матэрыялы для вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні змешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (http://www.profil.adu.by).

У вучэбным дапаможніку прадстаўлены не толькі тэксты параграфаў, але і фрагменты гістарычных дакументаў, картасхемы, табліцы, ілюстрацыі. Кожны раздзел пачынаецца са стужкі часу, на якой у храналагічнай паслядоўнасці адзначаны даты найважнейшых падзей з гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі. Работа са стужкай часу дазволіць вам успомніць і сістэматызаваць вучэбны матэрыял, вывучаны ў 8–9 класах.

Кожны новы параграф пачынаецца з «Воблака слоў» — гэта тыя паняцці, імёны гістарычных асоб, якія ўжо вывучаліся вамі ў папярэдніх класах і могуць зрабіцца асновай для далейшага пазнання гісторыі.

Абавязковыя для запамінання даты, гістарычныя паняцці, імёны гістарычных асоб вылучаны ў тэксце параграфа **паўтлустым** шрыфтам. Вывучаючы матэрыял, варта звяртаць увагу на інфармацыю, вылучаную *курсівам*. Яна важная для разумення гістарычных падзей, якія вывучаюцца.

Тэзісы, палажэнні, вынесеныя на палі вучэбнага дапаможніка, дапамогуць вам разабрацца ў галоўных ідэях тэксту, спросцяць пошук неабходнай інфармацыі ў параграфе.

Да тэкстаў параграфаў, табліц, схем, ілюстрацый, картасхем прапанаваныя пытанні і заданні. Яны спрыяюць асэнсаванню гістарычнай інфармацыі, усталяванню сувязей з раней вывучаным матэрыялам, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах. Адказы на гэтыя пытанні і заданні дазволяць вам сфарміраваць цэласную карціну гістарычнай мінуўшчыны.

Заданні з рубрык «Працуем з гістарычнай крыніцай», «Праводзім міні-даследаванне», «Гісторыя і сучаснасць» дазваляць пранікнуць у сутнасць гістарычных падзей і працэсаў, вызначыць сувязь гістарычных падзей, якія вывучаюцца, з сучаснай рэчаіснасцю. Выконваць заданні з гэтых рубрык можна як індывідуальна, так і ў групах.

Ключавыя ідэі кожнага параграфа сфармуляваныя ў вывадах, вылучаных *курсівам*. Для лепшага засваення вучэбнага матэрыялу прапануем канкрэтызаваць гэтыя ідэі вывучанымі гістарычнымі фактамі. У канцы кожнага параграфа прапанаваныя пытанні і заданні, якія могуць выкарыстоўвацца для самакантролю і замацавання засвоеных ведаў.

Табліца «Калі ў свеце... На тэрыторыі Беларусі» дапаможа сінхранізаваць найважнейшыя падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі, выявіць заканамернасці гістарычнага працэсу і асаблівасці развіцця Беларусі.

У канцы кожнага раздзела змешчаны практыкумы. Выконваючы прапанаваныя ў іх заданні, вы навучыцеся вылучаць заканамернасці і выпадковасці ў гістарычным працэсе, адрозніваць факт ад меркавання, ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі, аддзяляць галоўнае ад другаснага.

Заданні рубрыкі «Абагульненне па раздзеле» дазваляць вам замацаваць вывучаны матэрыял, абагульніць яго, сістэматызаваць, падрыхтавацца да кантролю ведаў па вывучанай тэме.

На ўроках па тэме «Наш край» вельмі важна зразумець, як гісторыя вашага рэгіёна, роднага краю была звязана з падзеямі, з'явамі і працэсамі айчыннай і сусветнай гісторыі. Рэкамендуем выкарыстоўваць на гэтых уроках гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць», матэрыялы краязнаўчых і школьных музеяў, публікацыі мясцовага перыядычнага друку.

У канцы вучэбнага дапаможніка прыведзеныя алфавітны паказальнік гістарычных паняццяў і храналагічная табліца.

Спадзяёмся, што вучэбны дапаможнік зробіць вывучэнне вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» цікавым, насычаным і творчым. Няхай разуменне мінуўшчыны зробіцца для вас крыніцай каштоўнасных арыенціраў, маральных перакананняў і вернасці тым ідэалам, якія былі створаны нашымі продкамі і прайшлі выпрабаванне часам.

*Аўтары*